Супрасльскі напеў



У панядзелак і Святым	Ты робіш анёламі Сваімі вятры і служыцелямі Сваімі — полымя вогненнае.
Нябесным бясплотным сілам:	Ty robiš aniołami Svaimi viatry i służycielami Svaimi — połymia vohniennaje.
У аўторак і дні памяці святых:	У вечнай памяці будзе праведнік, нядобрай славы не ўстрашыцца.
	U viečnaj pamiaci budzie praviednik, niadobraj sławy nie ŭstrašycca.
У сераду і святы Багародзіцы:	Келіх збаўлення прыму і імя Гасподняе паклічу. Kielich zbaŭlennia prymu i imia Haspodniaje pakliču.
У чацвер і святы апосталаў:	Па ўсёй зямлі прайшоў гук ад іх, і да краю сусвету словы іх.
	Pa ŭsioj ziamli prajšoŭ huk ad ich, i da kraju suśvietu słovy ich.
У пятніцу:	Збаўленне здзейсніў Ты пасярод зямлі, Божа. Zbaŭleńnie ździejśniŭ Ty pasiarod ziamli, Boža.
У суботу:	Усклікніце, праведнікі, Госпаду ў радасці: хвала пасуе праведным.
	Uskliknicie, praviedniki, Hospadu ŭ radaści: chvała pasuje praviednym.
На Ўздвіжанне:	Адлюстравалася на нас святло аблічча Твайго, Госпадзе.
	Adlustravałasia na nas śviatło abličča Tvajho, Hospadzie.
У дні памяці мучанікаў:	Радуйцеся, праведныя, у Госпадзе, шчырых належыць усхваляць.
	Radujciesia, praviednyja, u Hospadzie, ščyrych należyć uschvalać.
На Раство:	Збаўленне паслаў Госпад людзям Сваім. Zbaŭleńnie pasłaŭ Hospad ludziam Svaim.
На Вялікдзень:	Цела Хрыстова прыміце, з Крыніцы Несмяротнай спажывіце.
	Cieła Chrystova prymicie, z Krynicy Nieśmiarotnaj spažyvicie.
За спачылых:	Шчаслівыя тыя, каго абраў і прыняў Ты, Госпадзе, яны будуць памятаць Імя Тваё з роду ў род.
	Ščaślivyja tyja, kaho abraŭ i pryniaŭ Ty, Hospadzie, jany buduć pamiatać Imia Tvajo z rodu ŭ rod.

Arrangement © 2026 Кацярына Сянько
Belarusian text © prawaslaunajawarszawa.org · Licensed under CC BY-NC-ND 4.0